1. *Мелентьева, Ю. П.* Основные модификации чтения: особенности формирования и бытования / Ю.П.Мелентьева // Библиотековедение. – 2013. – № 5. – С. 54–62.

2. *Юрик, И. В.* Адаптация персонала библиотеки: методика, технология, опыт : учеб.-метод. пособие / И. В. Юрик. – М. : [Литера]. – 2011. – 142 с.

***С. А. Паўлава,***
*канд. філалагічных навук, дац.,*
*праф. каф. менеджменту ІДС БДУКМ*

## НАГЛЯДНАСЦЬ У БІБЛІЯТЭЧНАЙ РАБОЦЕ З ДЗЕЦЬМІ: СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД

У апошні час створаны аб’ектыўныя пасылкі і магчымасці для шырокага прадуктыўнага ўкаранення нагляднасці ў работу дзіцячых бібліятэк. Па-першае, неабходна прызнаць, што ўжо накоплены значны вопыт выкарыстання нагляднасці, ёсць і навуковыя асновы яго асэнсавання, абагульнення, распрацаваны рэкамендацыі па комплексе выкарыстання нагляднасці ў дзіцячых бібліятэках. Па-другое, развіццё комплексу навук аб чалавеку (педагогікі, псіхалогіі, філасофіі) дазваляе падыйсці да высвятлення сутнасці нагляднасці ў дачыненні да бібліятэчнай работы з дзецьмі. Па-трэцяе, з’яўленне сучасных тэхнічных і электронных сродкаў стварае прынцыпова новую аснову для рэалізацыі нагляднасці ў бібліятэчнай рабоце з дзецьмі.

Вывучэнне розных аспектаў нагляднасці звязана з працамі: І. В. Бахмуцкай [1, с. 5–11], Г. А. Івановай [6, с. 176–196], В. Л. Кабачэк [7, с. 87–94], А. Р. Левінай [9, с. 75–83], Т. Д. Полазавай [13 , с. 12–13], І. І. Ціхаміравай [15], Н. Я. Дворкінай [4], дзе прадстаўлены навуковы, навукова-метадычны і практычны вопыт бібліятэк. Асноўную групу складаюць даследаванні, прысвечаныя традыцыйнаму накірунку выкарыстання нагляднасці ў бібліятэчнай дзейнасці, якім з’яўляецца наглядная папулярызацыя літаратуры: работы Л. В. Белякова [2], А. У. Дз’ячковай [5], Л. А. Альшэўскай [11] і інш. Праблема выкарыстання аўдыёвізуальных матэрыялаў у нагляднай рабоце бібліятэк разглядаецца ў даследаваннях М. А. Чуасавіцінай [16], Л. В. Власава [3, с. 29–34]. Сучасныя тэндэнцыі развіцця тэорыі і практыкі выкарыстання нагляднасці ў бібліятэчнай рабоце (марке-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тынгавая дзейнасць: тэхналогія рэкламнай дзейнасці і паблік рылейшнз, арганізацыя асобай прасторы для кнігі і чытача ў бібліятэцы, медыйнай падтрымцы чытання і інш.) знайшлі адлюстраванне ў працах навукоўцаў: В. А. Барысавай, І. Ю. Матвеевай, С. Г. Матлінай, М. Я. Дворкінай.

Трактоўка паняцця «нагляднасці» даецца ў розных слоўніках аўтарытэтнымі філосафамі, навукоўцамі і спецыялістамі, якія працуюць у бібліятэказнаўстве і смежных навуках. Большасць даследчыкаў вылучаюць наступныя характарыстыкі нагляднасці: тое, што можна ўбачыць, успрыняць з дапамогай зроку, пачуць, адчуць, успрыняць з дапамогай слыху, дотыку, нюху і паказаць, прадэманстраваць, прадставіць непасрэднаму ўспрыманню (зрокаваму, слыхавому, тактыльнаму); тое, што зразумела, відавочна; тое, што можна прадставіць, уявіць, стварыць у мысленні вобраз.

Кожная з гэтых складальных нагляднасці можа рэалізоўвацца ў практыцы работы бібліятэкі пры выкарыстанні нагляднасці. На жаль, у слоўніках па бібліятэказнаўстве тэрмін «нагляднасць» не знайшоў адпаведнага тлумачэння. Нагляднасць у рабоце з дзецьмі – гэта сумоўе з дзіцянём на блізкай і прыемнай для яго, зразумелай яму мове, таму што ўспрыманне ў гэты перыяд жыцця мае пераважна наглядна-вобразны характар. Сродкі нагляднасці забяспечваюць стасункам прадуктыўнасць, паколькі дзяцінства настроена на яе ўспрымання.

Разнастайнасць магчымасцей выкарыстання нагляднасці ў бібліятэчнай рабоце з дзецьмі сведчыць аб мэтазгоднасці звярнуцца да сістэмнай метадалогіі, якая дастаткова плённа выкарыстоўваецца ў рашэнні тэарэтычных і практычных задач бібліятэказнаўства. Тэарэтычныя і метадычныя асновы гэтага закладзены ў працах М. С. Карташова [8, с. 1–19] атрымалі развіццё ў працах Ю. М. Сталярова [14]. Пра задачы работы з чытачамі аб эфектыўнасці сістэмнага падыходу піша М. Я. Дворкіна ў сваёй рабоце «Библиотечное обслуживание как система» [4, с. 2–3], дзе сцвярджаецца, што выкарыстанне сістэмнага падыходу дазволіць «раскрыць адзінства і ўзаемасувязь у гэтым працэсе дзейнасці бібліятэкара, чытача (фонд, ДБА і інш.), архітэктурна-планіровачнай, тэхнічнай базы, духоўнай складальнай бібліятэчнага асяроддзя; дае магчымасць пераадолець стэрэатыпы ў вывучэнні абслугоўвання чытачоў». На жаль, у тэорыі і методыцы бібліятэчнай работы з дзецьмі сістэмны па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыход не стаў дамініруючым. Па сутнасці, нагляднасць з’яўляецца адной з дэкампазіцый сістэмы «бібліятэка». На больш ніжэйшым узроўні гэта дэкампазіцыя з’яўляецца самастойнай сістэмай са сваімі дэкампазіцыямі (элементамі і сувязямі і патрабуе паглыбленага вывучэння). Напрыклад, даследаванне бібліятэчнага абслугоўвання як сістэмы ўжо мае свае вынікі. У гэтай сістэме вызначана дэкампазіцыя першасна-дакументальнага ўзроўню групавога і франтальнага абслугоўвання, які прадстаўлены выставачнай дзейнасцю бібліятэк. Безумоўна, такое разуменне нагляднасці звужае шматаспектнасць і глыбіню гэтай сферы дзейнасці дзіцячых бібліятэк. У разнастайнай дзейнасці дзіцячай бібліятэкі праглядаецца выкарыстанне нагляднасці.

Змест сістэмнага падыходу дазваляе ахарактарызаваць нагляднасць як сістэму ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Для практычнай рэалізацыі сістэмнага падыходу можна вылучыць сістэмныя ўтварэнні дэкампазіцыі па найбольш важных яе практычных аспектах: па функцыях дзіцячых бібліятэк, па прыярытэтах яе дзейнасці і развіцця, па відах дзейнасці, узроставых катэгорыях чытачоў, па формах работы з чытачамі; па відах носьбітаў інфармацыі і г.д. Чым больш гэтых падсістэм разглядаецца, тым паўней будзе вывучана праблема.

Разглядзім рэалізацыю ў практыцы работы дзіцячых бібліятэк: выкарыстанне нагляднасці ў аспекце непасрэднага ўспрымання (тое, што можна ўбачыць, пачуць, адчуць) можна і павінна дапамагчы дзіцяці: знайсці бібліятэку, дзякуючы архітэктуна-планіровачнаму дызайнерскаму вырашэнню будынка бібліятэкі і яскравай шыльды на фасадзе; пазнаёміцца з бібілятэкай падчас экскурсіі і непасрэдна ўбачыць размяшчэнне яе памяшканняў і аддзелаў, падчас атрымання кніг і таму падобнае; самастойна арыентавацца ў памяшканні бібліятэкі, дзякуючы размешчаным на відным месцы інфармацыйным стэндам і г.д.; убачыць кнігі ў адкрытым доступе, а самыя цікавыя з іх – на кніжна-ілюстраваных выстаўках; глыбей пранікнуць у змест літаратурнага твора, пачуць галасы птушак, шум прыбоя, характэрныя гукі з’яў прыроды падчас чытання аповесцей, вершаў аб прыродзе, убачыць ілюстрацыі да твораў, дакрануцца да прадметаў, якія апісваюцца ў кнізе, убачыць плады творчай дзейнасці іншых людзей на мастацкіх выставах, экспануемых у бібліятэках, а таксама прадэманстраваць свае работы, паўдзельнічаць у падобных выставах; вольна вандраваць у прасторы і ў часе пры праглядзе відэафільмаў і г. д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Юнаму чытачу павінна быць ясна і відавочна, што ён у бібліятэцы жаданы госць, любімы член вялікай сям'і чытачоў і служкаў Храма Кнігі, у якім аддзеле бібліятэкі можна браць кнігі на дом, дзе можна адпачыць, пагуляць, пагаварыць з равеснікамі, пашумець, а дзе неабходна саблюдаць цішыню і парадак; што кнігі патрабуюць беражлівых адносін; што чытач можа выказаць свае адносіны да прачытанага, да мерапрыемства, у якім ён прыняў удзел, і што яго голас будзе пачуты. Гэта ўсё забяспечваюць бібліятэкары шляхам арганізацыі бібліятэчнай прасторы і асяроддзя.

Выкарыстанне нагляднасці ў значэнні вобразнасці дапаможа юным чытачам: стварыць у сваім мысленні ўяўленне аб яе магчымасцях, аб сваіх правах і абавязках, чаму садзейнічаюць гутаркі бібліятэкара; пагрузіцца ў вобразную сутнасць твора мастацкай літаратуры праз ілюстрацыі да яго або інсцэніроўкі сюжэтаў гэтага твора праз удзел у розных мерапрыемствах; развіваць уяўленне, мову, памяць, вобразнае мысленне, у тым ліку на занятках па прыдумыванні вершаў, казак, малюнкаў.

Асобнага разгляду патрабуе дэкампазіцыя выкарыстання нагляднасці, яе роля ў рэалізацыі функцый дзіцячых бібліятэк (культурна-асветніцкая, адукацыйная, каштоўнасна-арыентацыйная, рэкламная, інфармацыйная, адаптацыйная), а таксама дэкампазіцыя нагляднасці пры здзяйсненні асноўных відаў дзейнасці бібліятэкі. Да асноўных відаў бібліятэчнай дзейнасці адносяцца: арганізацыя бібліятэчнага асяроддзя; камплектаванне і арганізацыя фондаў; бібліяграфічная работа; работа з чытачамі.

Дэкампазіцыя нагляднасці ў межах прыярытэтных накірункаў развіцця дзіцячых бібліятэк: выкарыстанне магчымасцей сучасных, у тым ліку мульцімедыйных тэхналогій, якія ўяўляюць неабмежаваныя магчымасці для ілюстравання, ўзмацнення нагляднасці, павышэння інфарматыўнасці выстаў і іншых форм бібліятэчнай работы за кошт выкарыстання наглядных матэрыялаў, атрыманых па каналах Інтэрнэт; арганізацыя развіваючых форм дасуга дзяцей, дзякуючы стварэнню кампутарных класаў. Разгляданне нагляднасці з пазіцый сістэмнага падыходу дазваляе звязаць разнастайныя, рознапланавыя аспекты праблемы, надаць ім цалкавасць, структурыраваць праблему.

Ужыванне нагляднасці, як і рашэнне любой складанай, шматпланавай праблемы, можа быць эфектыўна, калі яно рэалізуецца прафесійна граматнымі спецыялістамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Бахмутская, И. В.* Теоретические и практические проблемы совершенствования библиотечной работы с юными читателями / И. В. Бахмутская // Читатель и библиотека. Педагогика и психология чтения : сб. ст. по материалам межрегион. научн. конференции / научн. ред. Т. Д. Полозова. – М. : МГУК, 1994. – С. 5–11.

2. *Беляков, Л. В.* Пути повышения эффективности наглядной пропаганды литературы в библиотеке: дис. … канд. пед. наук / Л. В. Беляков. – М., 1965. – 219 с.

3. *Власов, Л. В.* использование в библиотеке аудиовизуальных материалов и средств и их классификация / Л. В. Власов // Н. и тех. б-ки СССР. – 1972. – № 6. – С. 29–34.

4. *Дворкина, М. Я.* Библиотечное обслуживание как система : учебн. пособие / М. Я. Дворкина. – М. : Изд-во МГИК, 1991. – 162 с.

5. *Дьячкова, Е. В.* Система работы с книжкой-игрушкой как средство формирования интереса к ниге и чтению : дис. … канд. пед. наук / Е. В. Дьячкова. – М., 1993. – 171 с.

6. *Иванова, Г. А.* Массовая работа с читателями / Г. А. Иванова // Руководство чтением детей и юношества в библиотеке / под ред. проф. Т. Д. Полозовой. – М. : МГУК, 1992. – С. 176–196.

7. *Кабачек, О. Л.* Развитие художественно-творческих способностей дошкольников в условиях библиотеки / О. Л. Кабачек // Библиотековедение. – 1995. – № 4/5. – С. 87–94.

8. *Карташов, Н. С.* О системном подходе к изучению и организации академических библиотек / Н. С. Карташов // Библиотечно-библиогр. информ. АН СССР и акад. наук союз. Республик. – 1967. – № 1. – С. 1–19.

9. *Левина, Е. Р.* Воображение – творчество – развитие личности / Е. Р. Левина, Т. М. Громан-Котенева // Читатель и библиотека. Педагогика и психология чтения : сб. по материалам межрегион. научн. конференции / Научн. ред. Т. Д. Полозова. – М. : МГУК, 1994. – С. 75–83.

10. *Матлина, С. Г.* Привлекательная библиотека или что может реклама : практ. пособие / С. Г. Матлина. – М. : Либерия, 1997. – 96 с.

11. *Ольшевская, Л. А.* Пропаганда художественной литературы в массовых библиотеках : формы и методы / Л. А. Ольшевская // Гос. публ. библиотека им. М. Е. Салтыкова-Щедрина. – М. : Книга, 1980. – 56 с.

12. *Полозова, Т. А.* Поможем детям открыть красоту / Т. А. Полозова // Библиотека. – 1994. – № 7. – С. 14–17.

13. *Полозова, Т. А.* Всем лучшим во мне я обязан книгам / Т. А. Полозова. – М. : Просвещение, 1990. – 255 с.

14. *Столяров, Ю. Н.* Библиотека : структурно-функциональный подход / Ю. Н. Столяров. – М. : Книга, 1981. – 255 с.

15. *Тихомирова, И.* Жизнь сердца и разума // Библиотека. – 1997. – № 1. – С. 50–53.

16. *Чусовитина, М. А.* Использование современных аудиовизуальных средств в руководстве чтением младших школьников : учеб. пособие / М. А. Чусовитина. – Л. : Изд-во ЛГИК, 1972. – 46 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ